Тэма 2. Функцыі мовы і маўлення

**1.** Падрыхтаваць адказы па на пытанні:

Камунікацыйная, намінацыйная, пазнавальная, рэгуляцыйная, фатычная, магічная, паэтычная, эмацыйна-экспрэсіўная, метамоўная, карпарацыйная і іншыя функцыі.

**2.** Выканаць заданні.

**2.1.** Прынясіце задачы па "Сб. задач по введению в языковедение" Б.Ю. Нормана (Мн., 1989): № 1.8, 1.42, 1.49–1.52; па Норман-2004: 2.8, 2.9, 2.37. Рашыце дзве любыя на выбар.

**2.2.** (49) Уявіце сабе сітуацыю. Нехта (назавем яго *X*) уваходзіць у пакой, дзе ўжо ёсць некалькі чалавек, і, паслядоўна абыходзячы іх, вітаецца з кожным за руку, напр.: "Добрай раніцы, Пятро Рыгоравіч". Але раптам чарговаму чалавеку (хай *У*) ён (*X*) рукі не падае, а кажа прыкладна наступнае: "А з Вамі мы ўжо віталіся (ці бачыліся)". Навошта ён *(X)* гэта кажа? І сам жа *X*, і *У* пра гэта ведаюць.

**2.3.** (413) Пад'язджаючы да патрэбнага вам прыпынка, вы пытаеце чалавека перад Вамі: "Ці Вы выходзіце?" – "Не", – адказвае ён і не рухаецца з месца. У чым ненатуральнасць, "няправільнасць" гэтай сітуацыі? Якая яе моўная прырода?

**2.4.** (418) Часта чалавек пачынае размову словамі тыпу *паслухайце, ведаеш што, ці вы ведаеце, бачыце* ці зваротам да суразмоўцы па імені, хаця побач з тым нікога няма, так што такі зварот таксама не мае асаблівага сэнсу. Навошта моўца так робіць?

**3.** Рэфераты для жадаючых (10 хвілін): 1) Маўленчы акт і функцыі мовы ў канцэпцыі Р.В. Якабсона" (па арт. "Лінгвістыка і паэтыка" ў зб. «Структурализм: за и против». М., 1975); 2) Маўленчы акт і функцыі мовы ў канцэпцыі А.К. Кіклевіча (па "Лекцыі № 2" у яго кн. «Лекции по функциональной лингвистике». Мн., 1999); 3) Функцыі мовы і маўлення ў канцэпцыі А.Я. Міхневіча (па яго кн. "Выбраныя працы". Мн., 2006 ці па зб. "Пытанні білінгвізму і ўзаемадзеяння моў". Мн., 1982); 4) Сучасныя падыходы да праблемы "мова і мысленне".